


## Устойлівае развіцце на мясцовым узроўні

Праект меў некалькі састаўляючых. Адна з іх — распрацоўка і рэалазацыя мясцовых стратэгій устойлівага развіцця: Мясцовых павестак-21. Іншая — развіцце зяленага турызму шляхам утварэння сеткі Зялёных маршрутаў. Гэта турыстычныя маршруты прыроднай і культурная спадчыны, пракладзеныя ўздоўж «зяленых карыдораў» — рэк, традыцыйных і гістарычных гандлёвых шляхоў, натуральных прыродных карыдораў.

На працягу 2009 года праводзілася работа з абвяшчэння мясцовых грамадаў рэгіенаў Беларусі аб прынцыпах устойлівага развіцця, сутнасці Мясцовых павестак-21 і Зялёных маршрутаў. Ажыццяўляўся пошук ініцыятыўных асоб і адбор рэгіёнаў. Астатнія павінны былі падаць узгоджаныя з удзелам грамадзкасці і мясцовай улады заяўкі.

Пасяджэнне Конкурснай камісіі праекту з папярэдняга адбору пілотных рэгіенаў для яго рэалізацыі адбылося ў жніўні. Прычым жадаючых аказалася намнога больш запланаванага — 58 ад органаў мясцовага кіравання раённага, гарадскога, пасёлкавага і вясковага ўзроўняў. Таму было вырашана павялічыць колькасць пілотных рэгіенаў з 24 да 35.

Затым адбыліся 20 трэнінгаў у большасці пілотных рэгіенаў. На іх навучалі ініцыятыўныя групы з прадстаўнікоў мясцовай улады і грамадзкасці методыцы падрыхтоўкі Мясцовых павестак-21. Што датычыцца стварэння сеткі Зялёных маршрутаў, то 28-29 кастрычніка ў вёсцы Павязынь Маладзечанскага раёну адбыліся практычны трэнінг “Зялёныя маршруты» ў Рэспубліцы Беларусь: Асноўныя методыкі распрацоўкі і рэалізацыі з улікам замежнага вопыту. Ён адбыўся ў аграсядзбе «У Іванавіча». У мерапрыемстве ўзялі ўдзел каля 40 беларускіх спецыялістаў у галіне турызму, гаспадароў аграсядзіб, зацікаўленых у стварэнні Зялёных маршрутаў. Беларускія эксперты праекту Валерыя Кліцунова, Наталля Юргенсан і Анатолій Касьяненка падзяліліся сваімі метадычнымі напрацоўкамі ў стварэнні Зялёных маршрутаў, ацэнкі патрабаванняў, фармавання ўмоу для іх утварэння і прасоўвання як турыстычнага прадукту. Замежны эксперт праекту Эндру Сшпіга (Велікабрытанія) расказаў пра міжнародны вопыт у гэтай галіне навёў шэраг прыкладаў паспяховай рэалізацыі падобнай канцэпцыі ў Брытаніі і іншых краінах Еўрасаюзу. На меркаванне эксперта Беларусь мае добры прыродны і людскі патэнцыял для фармавання паспяховай рэалізацыі Зялёных маршрутаў. Удзельнікі трэнінгу наведалі найбольш цікавыя прыродныя аб'екты Маладзечанскага раёну, прыстасаваныя для стварэння экалагічных музеяў і Зялёных маршрутаў.

А 17-18 лістапада ўдзельнікі Ініцыятыўных груп усіх 35 пілотных рэгіенаў сабраліся на семінар-трэнінг "Міжнародны вопыт устолівага развіцця тэрыторый: патэнцыял, навыкі практычнай рэалізацыі і эфекты Мясцовай павесткі-21". Міжнародны эксперт Ахто Ойя (Эстонія) падзяліўся практычным вопытам ініцыявання і рэалізацыі такіх мясцовых стратэгіяў у еўрапейскіх краінах.

На семынары-трэнінгу паведамілі пра пачатак праграмы фінансавай падтрымкі мясцовых ініцыятыў у межах праекту «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні».

Яна працягнецца да 31 студзеня 2010 года. Фізічныя і юрыдычныя асобы на тэндэрнай падставе могуць атрымаць фінансавую дапамогу ў памеры да 3 тысячаў або да 8 тысячаў долараў ЗША — у залежнасці ад віду Ініцыятывы. Прыярытэтнымі Кірункамі з'яўляюцца павышэнне сацыяльнай актыўнасці мясцовых грамадаў для ўстойлівага развіцця тэрыторый, адукацыя для ўстойлівага развіцця, паляпшэнне турыстычнай інфраструктуры ўздоуж Зяленых маршрутаў і ўтварэнне экамузеяў. Фінансаванне будзе дадзена Ініцыятывам, якія перш за ўсе важлівыя наогул для развіцця рэгіёну.

Таксама ўмовай з'яўляецца актыўны ўдзвл пілотных тэрыторыяў у распрацоўцы Мясцовай павесткі 21 у межах праекту «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні». Гэта значыць у рэгіёне павінны быць

ініцыятыўная група і зацверджаная мясцовай уладай канцэпцыя асноўных палажэнняў Мясцовай павесткі-21 для канкрэтнай тэрыторыі.

Больш пра праект «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні» можна даведацца на ягоным сайце: www.ecorazuitie.by.

Источник: Евробюллетень.-2009.-№5.-С.9